# ГАСПАДАРКА ХАМІНСКІХ

Маёнтак у Альшэва з самага першага дня свайго існавання быў развітой шматгаліновай гаспадаркай, дзе, прымяняючы на практыцы самыя прагрэсіўныя тэхналогіі, Хамінскія змаглі стварыць надзейную гаспадарку, дзейнасць якой дазваляла памнажаць дабрабыт наваколля Блакітных азёр.

Ва ўладаннях Хамінскіх будавалася службовае жытло, дзейнічалі школа для дзяцей, сядзібная лаўка, 2 карчмы. У сярэдзіне XIX стагоддзя 915 дзесяцін зручнай зямлі абраблялі жыхары хутара Бакшты, 4 засценкаў (Янава, Харэўшчызна, Таўкунец, Кавалёўшчызна) і 8 вёсак, пры гэтым у 1881 годзе **Станіслаў Хамінскі** праз выкуп уладанняў сясцёр Гюнтэр у маёнтку “Дабраўляны” павялічыў гаспадарку да 4 000 дзесяцін.



Альшэўская гаспадарка ўсю сваю гісторыю ўяўляла сабой складаны комплекс, дзе актыўна развівалася жывёлагадоўля і раслінаводства. Жывёлагадоўчы комплекс мясціў у сабе кароўнікі, бычнік, стайні, аўчарні.

**Людвік Хамінскі** ў XX стагоддзі для павелічэння надою завёз з Галандыі элітных фрызскіх кароў, якія па факту аказаліся непрыстасаванымі да мясцовых умоў, пачалі хварэць на туберкулёз і даваць малако нізкай тлустасці.

Няўдалы эксперымент прывёў да таго, што Хамінскі вярнуўся да гадоўлі мясцовай чырвонай пароды кароў, якая была не толькі добра прыстасавана да знешніх умоў, але і давала да 4 000 літраў малака высокай тлустасці ад адной галавы. Па выніках сваёй працы Людвік выдаў дыскусійную брашуру: “Чырвоная мясцовая жывёла ў Літве”.

Навакольныя прыродныя ўмовы спрыялі развіццю пчалаводства і рыбагадоўлі. Па ўспамінам мясцовых жыхароў:

> **“...пан Хамінскі, каб мець для двара неабходную колькасць мёду, даў аднаму з мясцовых жыхароў зямлю, лес на забудовы, права ў панскім лесе выкарыстоўваць для развядзення пчол дуплістыя дрэвы і абавязаў займацца здабычай мёду.”**

Мясцовыя пчалаводы працягвалі шматгадовую гісторыю традыцыйнага бортніцтва, пры якой пчолы утрымліваліся і разводзіліся ў натуральных дуплах дрэў і барцях (борці – штучныя дуплы для дзікіх пчол, якія выдзёўбвалі (барцілі) у дрэве з дапамогай барты – сякеры з шырокім лязом). Не здарма на мясцовасці існаваў хутар з назвай Бортнікі.

Напрыканцы 1920-х гадоў ў прамысловых маштабах у Альшэва пачала развівацца рыбагадоўля, калі **Людвік Хамінскі** разам з Эдвардам Скірмунтам з Шэметава наладзілі складаную водную сістэму з сажалак і дамб. На ручаі, які выцякае з возера Глубля і цячэ да Страчы, уручную было выкапана 15 сажалак, якія злучаліся адна з адной каналамі і падземным трубаправодам.

Для вырошчвання малька выкарыстоўваліся 4 асноўныя сажалкі: Рударэя, Сцякліца, Амежа і Церабежэ, у якіх ў зімовы час вык для захоўвалася рыба на продаж. Праз успаміны мясцовых жыхароў можна ўявіць, як праходзіў працэс адлову рыбы :

**“... у якасці сродку адлову рыбы ўжываліся драўляныя рашоткі з ячэйкамі памерам 1x1 метр, якія ўмярзалі ў лёд і трымалі яго вагу на сябе. Калі з возера спускалі ваду пад лёд праз прарублены ход спускаўся чалавек, які адбіраў неабходную колькасць рыбы, пасля чаго ў возера зноў напускалі ваду. Жывую рыбу вазілі ў Свянцяны ў спецыяльных бочках, адкуль везлі чыгункай у Вільню ці Варшаву на продаж. “**

Самым цікавым і незвычайным напрамкам гаспадаркі было вырошчванне ў міжваенныя гады ХХ стагоддзя слімакоў і жаб у Камараўшчызне (Камарова) на продаж у краіны Еўропы.

Для забяспечвання ўласных патрэб у свежай агародніне і садавіне недалёка ад дома яшчэ ў XVIII стагоддзі быў закладзены пладовы сад і вялікі агарод. Для вырошчвання збожжа выкарыстоўвалася большая частка пахатных зямель.

Амаль насупраць сядзібнага дому быў пабудаваны бровар (вінакурня) - цэх па вытворчасці або выгану спірту з раслінай сыравіны. У 1890 году тут была ўсталявана паравая машына і працавала 12 чалавек. **Аляксандр Хамінскі** ў свой час быў кіраўніком камітэту вінакурства ў Віленскім таварыстве сельскай гаспадаркі.

**Гідраэлектрастанцыя**
**фота Ян Булгак**



На некалькіх вадзяных млынах на раке Страча займаліся перапрацоўкай атрыманага ўраджаю. Напрыклад, вадзяны млын каля вёскі Куелі быў разлічаны на перапрацоўку 50 000 кілаграм зерня ў год, памалоць 1 пуд зерня ў вясну і дажджлівае надвор’е на ім каштавала 2 капейкі, у сухое надвор’е – 4 капейкі, пітляванне пшаніцы – 7 капеек, выраб круп – 12-17 капеек. Млынар атрымліваў за сваю працу 150 рублёў у год і

бясплатнае жытло. У 1903 годзе гэты млын быў рэканструяваны: там была пастаўлена гарызантальная турбіна сістэмы Жонваля або Францыса.

Млын выкарыстоўваўся не толькі як мукамольны, але і праз турбіны прыводзіліся ў рух ткацкія і магчыма прадзільныя станкі. На пачатку XX стагоддзя на Альшэўскіх млынах былі ўсталяваны паравыя рухавікі. А ў 1900 годзе на рацы Страча з'явілася першая гідраэлектрастанцыя.

Якаснае сукно з авечай воўны ў XVIII-XIX стагоддзі на рынку было запатрабаваным таварам, таму ў Альшэва быў створаны фалюш, дзе пад час паступовых аперацый воўна ператваралася ў тканіну, якая ў асноўным потым шла на ваеныя патрэбы.

Край Блакітных азёр – гэта прыгожыя і бясконцыя лясы. Перапрацоўка драўніны складала вялікую частку прыбытку маёнтка: у XIX стагоддзі па Страчы быў наладжаны сплаў драўніны на продаж, а напрыканцы XIX стагоддзя **Аляксандр Хамінскі** адсяліў невялікую вёску Лукша з берага Страчы, а на самой раке пабудаваў плаціну, адрамантаваў млын і пабудаваў лесапілку (тартак). Вадзяное кола з дапамогай сістэмы шасцерняў прыводзіла ў рух пілараму, з дапамогай якой нарыхтоўвалі дошкі і бярвенні.

Пні, якія заставаліся пасля высечкі лесу, таксама шлі на перапрацоўку, дзе з іх выраблялі дзёгаць, драўняны вугаль і паташ. Каля Грумбінентаў пры Аляксандры Хамінскім была створана смалярня, якая перапрацоўвала больш за 1000 кубічных метраў пнёў.

**"У лесе гэты працэс адбываўся наступным чынам: у невялікае паглыбленне кучай звальваліся пні дрэў і розныя рэшткі ад нарыхтоўкі драўніны, затым гэтая куча засыпалася лясным ападам, высцілалася мохам, дзірваном, утрамбоўвалася пяском і падпальвалася. Атрымлівалася своеасаблівая зачыненая печ, у якой ва ўмовах высокай тэмпературы і без доступу кіслароду павольна тлела драўніна, ператвараючыся ў драўняны вугаль, а на дне збіралася смала, церпенцін ці дзёгаць."**

**Спіхлер (амбар)**
**фота Ян Булгак**



Адным з самых каштоўных прадуктаў перапрацоўкі быў паташ, які ішоў на выраб мыла, шкла і салетры для пораху. Атрымлівалі яго шляхам воднай экстракцыі з расліннага попелу з далейшай ачысткай да неабходнага ўзроўню.

Таксама была пабудавана сушылка шышак для нарыхтоўкі якаснага насеннага матэрыялу для аднаўлення высечаных лясоў.

Якаснамі прадуктамі харчавання забяспечвала малачарня, на якой рабілі сыры і масла, якіх было рэалізавана на 1 500 рублёў па выніках 1911 года.



**лядоўня ў Альшэва**

Вялікая гаспадарка патрабавала шмат будаўнічых матэрыялаў, таму у Альшэва для зніжкі сабекошту былі створаны розныя будаўнічыя прадпрыемствы.

Каля вёскі Барысы, побач з залежамі дабраякаснай гліны, была зроблена цагельня, якая была цэлым саматужным комплексам: капальні, дзе здабывалі гліну, вылежні-пляцоўкі, дзе гліна “спела”, майдана - месца для замешвання сыравіны, фармовачнага навеса, плінтовак - роўных крытых пляцовак для сушкі сырца, печы-цагельніцы, дзе абпальвалася цэгла і складоў для гатовай прадукцыі.

На цагельні выраблялі цэглу-сырэц, з якой муравалі печы, грубкі, ляжанкі; стандартную, а таксама нестандартную цэглу з рэльефнымі малюнкамі і арнаментам для абліцоўкі комінаў і печаў, вогнетрывалую цэглу; дрэнажныя трубкі, таксама рабілі на цагельні і чарапіцу – штучны даховы матэрыял.

З Альшэўскай цэглы быў пашыраны жывёлагадоўчы комплекс, пабудаваны дамы для парабкаў і прыбудаваны мураваныя крылы да сядзібнага дома. Вытворчасць дахоўкі працягнулася і ў XX стагоддзі Старжынскімі - ўладальнікамі Камарова –, якія на ёй заставілі свой герб “Ліс” і манаграму “Віктар Граф Старжынскі”.



Праз розныя падзеі XX стагоддзя няспынны рух часу аказаў негатыўны ўплыў на стан гаспадаркі Хамінскіх. Бровар згарэў у час Першай сусветнай вайны. Тартак, млын і электрастанцыю спалілі ў час Другой сусветнай вайны. З цягам часу многія будынкі разабралі на іншыя патрэбы. Толькі пабудовы жывёлагадоўчага двара захаваліся да нашых дзён і на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў XX стагоддзя выкарыстоўваліся па свайму прызначэнню.



Пасля стварэння ў 1949 годзе калгаса вадзяны млын у Куелях быў нацыяналізаваны і па ўспамінам мясцовых жыхароў працаваў да 1950-1960-х гадоў XX стагоддзя. Што з ім здарылася далей – не вядома. Зараз яго рэшткі ўтвараюць маляўнічы пейзаж на турстаянцы “Мельніца” у заказніку “Блакітныя азёры”.




**Рэшткі млына (механізмы 1903 года)**

Праіснавала да 1980 гадоў сістэма рыбагадоўчых прудоў, заснаваная Людвікам Хамінскім, якая нават пэўны час выкарыстоўвалася па сваім прызначэнні.

З цягам часу рыбгас закінуў сажалкі і спусціў ваду. Толькі ў XXI стагоддзі мясцовы жыхар паправіў плаціну, апасля чаго пакрыху пачалі аднаўляцца пруды Амежа і Сцякліца.

Хамінскія, адукаваныя, граматныя і руплівыя гаспадары, змаглі стварыць ідэальна працуючую сістэму шматгаліновай гаспадаркі, рэшткі якой яшчэ не позна пабачыць і ў сённяшні час.